# ІНТЭРАКТЫЎНЫ МЕТАД «АКВАРЫУМ» ЯК СПОСАБ ФАРМІРАВАННЯ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ Ў НАВУЧЭНЦАЎ I– IV КЛАСАЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

**Шылава Алена Савельеўна**
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ ім. М. Танка,
Мінск, Рэспубліка Беларусь
**Мурашка Наталля Уладзіміраўна**
Магістр, настаўнік пачатковых класаў ДУА «СШ № 196 г. Мінска»
Мінск, Рэспубліка Беларусь

***Анатацыя:*** *праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў I–IV класаў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць разумення яе сутнасці для пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, інтэрактыўны метад «Акварыум».*

Адной з важных задач на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. Працэс яе фарміравання на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання з'яўляецца крапатлівым і патрабуе пэўных намаганняў. У такім выпадку трэба шукаць варыянты правядзення ўрокаў, калі ствараюцца ўмовы не толькі для вывучэння новага матэрыялу навучэнцамі з рознымі ўзроўнямі матывацыі, але і адначасова для моўнай практыкі **кожнага** вучня на **кожным** уроку.

Разгледзім адзін з альтэрнатыўных метадаў фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, які мы адаптавалі для прымянення з навучэнцамі I ступені агульнай сярэдняй адукацыі і які можна выкарыстоўнаць на прадмеце «Літаратурнае чытанне».

Цікавым спосабам правядзення ўрокаў абагульнення і сістэматызацыі ведаў з'яўляецца інтэрактыўны метад «Акварыум» [1; 2].

Мэта правядзення гэтага метаду заключаецца ў абагульненні і сістэматызацыі ведаў, а таксама праверцы засваення вывучанага матэрыялу навучэнцамі па раздзелу праграмы; у навучанні школьнікаў прыёмам самааналізу, супастаўлення, параўнання; фарміраванні навыкаў групавога ўзаемадзеяння; выхаванні ў іх такіх якасцяў як узаемадапамога, дружалюбнасць, сумленнасць, справядлівасць, талерантнасць.

Для правядзення гэтага метаду настаўніку неабходна падрыхтаваць спецыяльнае абсталяванне: карткі з назвай «Назіральнікі», «Эксперты» і класнае памяшканне.

Для правядзення гэтага метаду ў сярэдзіне класа або каля дошкі неабходна асвабадзіць месца для «акварыума» (круг ці квадрат, які намаляваны крэйдай на падлозе); два сталы расставіць ў розных частках вучэбнага памяшкання і паставіць на іх карткі з назвай «Назіральнікі», «Эксперты».

Пры выкарыстанні гэтага метаду на ўроках настаўнік павінен стварыць умовы для забеспячэння спрыяльнай атмасферы зносін паміж удзельнікамі кожнай каманды.

Пакажам тэхналогію рэалізацыі інтэрактыўнага метаду «Акварыум» на ўроку абагульнення і сістэматызацыі ведаў у трэцім класе пасля вывучэння раздзела праграмы «Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае» [3].

**Першы этап (падрыхтоўчы).**

Настаўнік паведамляе вучням, што сёння на ўроку яны будуць правяраць адзін у аднаго веды па раздзелу праграмы «Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае», фіксуе спіс з тэм на дошцы або на слайдзе пад пэўным нумарам, напрыклад:

№ 1. Прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям'і. Беларускія народныя казкі «Недалікатны сын» і «Зайздросны дзядзька».

№ 2. Прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям'і. Іван Муравейка «Лыжкай па лбе», Артур Вольскі «Хачу служыць».

№ 3. Прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям'і. Іван Шамякін «Пастух», Генадзь Аўласенка «Чыя мама лепшая?».

Настаўнік знаёміць вучняў з правіламі рэалізацыі метаду.

***Настаўнік (Н.):*** Зараз мы паспрабуем з вамі ў думках стварыць акварыум, кожны з вас пабывае ў трох ролях: «рыбак», «назіральнікаў», «экспертаў».

Вучні ў ролі «рыбак» павінны будуць «плаваць» (вольна прыгожа рухацца) у акварыуме, але па маім сігнале яны спыняюць рух і ўважліва слухаюць пытанне. Пасля гэтага «рыбкі» паказваюць свае веды па тэме і ўменні спраўляцца з любымі цяжкасцямі, якія будуць сустракацца пры адказах на пытанні.

Вучні ў ролі «назіральнікаў» будуць уважліва назіраць за «рыбкамі» і параўноўваць іх адказы на пытанні са сваімі, г.зн. што кожны «назіральнік» на сваім месцы павінен вусна падрыхтаваць адказ, пры гэтым **карыстацца падручнікам не дазваляецца**.

Вучні ў ролі «экспертаў». Хто з вас ведае, хто такі эксперт?

**Вучань (В.):** Я думаю, што гэта той, хто правярае.

***Н.:*** Вы ў мяне ўсё ведаеце! Як прыемна з вамі працаваць!

Эксперт – гэта вучань, які правярае правільнасць адказаў на пытанні, прадстаўленых ўдзельнікамі іншых каманд, у нашым выпадку вучнямі ў ролі «рыбак».

Вучні ў ролі «экспертаў» павінны фіксаваць усе цяжкасці ў «рыбак» пры адказах на пытанні і таксама падрыхтаваць правільныя адказы, пры гэтым яны **маюць права карыстацца падручнікам**.

Навучэнцы класа дзеляцца на тры каманды пры дапамозе каляровых стыкераў: чырвоных, жоўтых і зялёных, якія раскладзеныя на стале настаўніка. Кожны з іх бярэ сабе ў рукі стыкер таго колеру, які яму падабаецца.

У кожнай камандзе вучні выбіраюць капітана. Настаўнік прапануе капітанам выцягнуць карткі, на якіх запісаныя нумары і тэмы. Нумар на картцы паказвае на чарговасць удзельнікаў каманды быць у ролі «рыбак», г.зн., калі капітан выцягнуў картку пад № 1, значыць гэтая каманда ў поўным складзе заходзіць у «акварыум» і ўсе ўдзельнікі будуць «рыбкамі». Яны павінны будуць адказваць на пытанні настаўніка па тэмах, пазначаных на гэтай картцы: прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям'і. Беларускія народныя казкі «Недалікатны сын» і «Зайздросны дзядзька».

**Другі этап: праца ў камандзе.**

Кожная каманда атрымлівае заданні па сваіх тэмах:

- паўтарыць прыказкі і тэксты твораў;
- падрыхтавацца адказваць на пытанні настаўніка.

Для эфектыўнай працы ўсіх удзельнікаў каманды капітан размяркоўвае сярод іх, хто за якія тэмы будзе адказваць.

Так, напрыклад, калі ў класе 24 чалавекі, то ў кожнай камандзе па 8 чалавек. У камандзе пад № 1 размеркаванне па тэмах можа адбывацца наступным чынам:

–2 вучня адказваюць за прыказкі;

–2 вучня за тлумачэнне сэнсу прыказак;

–2 вучня за тэкст казкі «Недалікатны сын»;

–2 вучня за тэкст казкі «Зайздросны дзядзька».

*Настаўнік у залежнасці ад колькасці навучэнцаў у класе сам вызначае на колькі каманд іх падзяліць і якія тэмы ўзяць для абагульнення і сістэматызацыі ведаў.*

**Трэці этап.** Усе ўдзельнікі каманд займаюць свае месцы:

–каманда № 1 у ролі «рыбак» у «акварыуме»;

–каманда № 2 у ролі назіральнікаў і каманда № 3 у ролі экспертаў за сталамі, на якіх загадзя расстаўлены таблічкі з надпісамі: «Назіральнікі»,«Эксперты».

**Чацвёрты этап.** Настаўнік прадстаўляе ўдзельнікаў рэалізацыі метаду, яшчэ раз паўтарае іх асноўныя функцыі і называе тэмы, па якіх будуць задавацца пытанні для ўдзельнікаў у ролі «рыбак».

**Пяты этап.**

1) Настаўнік па чарзе задае пытанні камандзе № 1.

***Пытанні для каманды № 1.***

***Прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям'і. Беларускія народныя казкі «Недалікатны сын» і «Зайздросны дзядзька».***

1. Працягніце прыказку: «Ад добрага …» («Ад добрага не ўцякай і благога не рабі» [3, с. 7].)
2. Растлумачце сэнс гэтай прыказкі.
3. Працягніце прыказку: «Хітрэйшы за …» («Хітрэйшы за ўвесь свет не будзешь» [3, с. 7].)
4. Растлумачце сэнс гэтай прыказкі.
5. Назавіце дзеючых асоб казкі «Недалікатны сын» і ахарактарызуйце кожнага з іх.
6. Чаму навучыў бацька сына ў казцы «Недалікатны сын»?
7. Назавіце дзеючых асоб казкі «Зайздросны дзяцька» і ахарактарызуйце кожнага з іх.
8. Які ўчынак зрабілі браты ў казцы «Зайздросны дзяцька»?

Пасля таго, як настаўнік задаў першае пытанне, удзельнікі кожнай каманды выконваюць наступную працу:

–навучэнцы ў ролі «рыбак», прыгожа рухаючыся ў «акварыуме», абмяркоўваюць на працягу 1 хвіліны, як правільна адказаць на пытанне. Капітан каманды прызначае вучня, які будзе на яго адказваць;

–навучэнцы ў ролі назіральнікаў за «рыбкамі» выбіраюць тых вучняў, якія вельмі прыгожа рухаецца, і сумесна абмяркоўваюць, як правільна адказаць на пытанне настаўніка, а затым параўноўваюць адказ каманды са сваім;

–навучэнцы ў ролі экспертаў абмяркоўваюць правільнасць адказу каманды на пытанне настаўніка, параўноўваюць яго з матэрыялам у падручніку і, калі заўважаюць недакладнасці або памылкі, дапаўняюць або выпраўляюць адказ.

Аналагічным чынам адбываецца праца навучэнцаў падчас адказу на наступныя пытанні настаўніка.

Затым каманда № 1 праводзіць фізкультмінутку з удзельнікамі іншых каманд.

2) Па камандзе настаўніка ўдзельнікі кожнай каманды мяняюць сваё месцазнаходжанне наступным чынам:

–каманда № 2 займае месца ў «акварыуме»;

–каманда № 3 займае месца за сталамі, прызначаных для назіральнікаў;

–каманда № 1 займае месца за сталамі, прызначаных для экспертаў.

Настаўнік па чарзе задае пытанні камандзе № 2.

***Пытанні для каманды № 2.***

***Прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям'і. Іван Муравейка***
***«Лыжкай па лбе», Артур Вольскі «Хачу служыць».***

1. Працягніце прыказку: «Як ён да …» («Як ён да людзей так і людзі да яго» [3, с. 7].)

2. Растлумачце сэнс гэтай прыказкі.

3. Працягніце прыказку: «Самая балючая …» («Самая балючая рана ад свайго дзіцяці» [3, с. 7].)

4. Растлумачце сэнс гэтай прыказкі.

5. Назавіце дзеючых асоб апавядання І. Муравейкі «Лыжкай па лбе» і ахарактарызуйце кожнага з іх.

6. Якія традыцыі былі ў сям'і ў апавяданні «Лыжкай па лбе»?

7. Дайце характарыстыку хлопчыка з верша А. Вольскага «Хачу служыць».

8. Раскажыце пра мары хлопчыка з верша А. Вольскага «Хачу служыць».

Пасля адказу на ўсе пытанні, каманда № 2, якая выконвала ролю «рыбак», праводзіць фізкультвілінку з удзельнікамі іншых каманд.

3) Па камандзе настаўніка ўдзельнікі кожнай каманды мяняюць сваё месцазнаходжанне наступным чынам:

–каманда № 3 займае месца ў «акварыуме»;

–каманда № 1 займае месца за сталамі, прызначаных для назіральнікаў;

–каманда № 2 займае месца за сталамі, прызначаных для экспертаў.

Настаўнік па чарзе задае пытанні камандзе № 3.

***Пытанні для каманды № 3.***

***Прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям'і. Іван Шамякін «Пастух»,***
***Генадзь Аўласенка «Чыя мама лепшая?».***

1. Працягніце прыказку: «Што ў …» («Што ўмаленстве выхаваеш, на тое ў старасці абапрэшся» [3, с. 7].)

2. Растлумачце сэнс гэтай прыказкі.

3. Працягніце прыказку: «Бацькоў …» («Бацькоў слухаць – гора не знаць» [3, с. 7].)

4. Растлумачце сэнс гэтай прыказкі.

5. Назавіце дзеючых асоб апавядання І. Шамякіна «Пастух» і ахарактарызуйце кожнага з іх.

6. Якая асноўная думка закладзена пісьменнікам ў апавяданні «Пастух»?

7. Назавіце дзеючых асоб верша Г. Уласенкі «Чыя мама лепшая?» і ахарактарызуйце кожнага з іх.

8. Як вы разумееце асноўную думку верша Г. Уласенкі «Чыя мама лепшая?».

Пасля адказу на ўсе пытанні, каманда № 2, якая выконвала ролю «рыбак», праводзіць фізкультвілінку з удзельнікамі іншых каманд.

**Шосты этап.** Настаўнік падводзіць вынікі працы навучэнцаў і рэфлексію, задаючы пытанні аб тых цяжкасцях, з якімі яны сутыкнуліся.

Такім чынам, прадстаўленая тэхналогія рэалізацыі інтэрактыўнага метаду «Акварыум» на ўроках «Літаратурнага чытання» дазваляе абагульніць, сістэматызаваць веды навучэнцаў, праверыць засваенне вывучанага матэрыялу па раздзеле праграмы; развіваць уменні працаваць з навучальным дапаможнікам: хутка знаходзіць у ім адказы на пытанні настаўніка; навучаць прыёмам самааналізу, супастаўлення, параўнання; спрыяць эмацыйнай насычанасці працэсу навучання; фарміраваць навыкі групавога ўзаемадзеяння; фарміраваць маўленча-камунікатыўную кампетэнцыю; выхоўваць такія якасці як узаемадапамога, сумленнасць, справядлівасць, талерантнасць.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Кашлев, С. С. Интерактивные методы обучения : учеб.-метод. пособие / С. С. Кашлев. – 2-е изд. – Минск : ТетраСистемс, 2013. – 224 с.

2. Шилова, Е. С. Технология реализации интерактивного метода «Аквариум» на уроках «Человек и мир» в III классе / Е. С. Шилова // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2021. – № 5. – С. 8–11.

3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 3 кл. устаноў агульнай сэрэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 2. – 120 с. : іл.

## КРЕАТИВТІ ОЙЛАУҒА БАҒЫТТАЛҒАН ТАПСЫРМАЛАР ТҮРЛЕРІ

**Курманиязова Алтыншаш Аслановна**
«Сәулет» мектеп-лицейінің география пәні мұғалімі
педагог-сарапшы

**Өзектілігі:** Қазіргі таңда білім мен ғылым заманына сай оқушылардың жан-жақты тұлға болып қалыптасуы өте маңызды. Осыған орай білім алушылардың халықаралық тұрғыда бақылау үшін PISA-2000 жылы алғаш өткізіліп, оған 43 мемлекет қатысқан болатын. Қазіргі таңда осы бағыт бойынша қатысушы ел саны артуда. Оның негізгі себебі заман талабына сай білім мен ғылымның дамуы болып отыр. PISA 15-жастағы білім алушылардың математикалық, жаратылыстану және оқу сауаттылығы деңгейлерін бағалайтын халықаралық зерттеуі болып табылады.

**Жұмыстың мақсаты:**

1. Оқушылардың жаратылыстану сауаттылығы бойынша креативті ойлау дағыдысын арттыру үшін берілетін тапсырма түрлерін сипаттау;
2. Берілген тапсырманың маңыздылығын практика жүзінде қолданылуының нәтижесімен таныстыру.

**Осы мақсатқа жету үшін қойылған міндеттер:**

-Креативті ойлау аспектісінінің мағынасына тоқталу;

-Креативті ойлай аспектісі бойынша тапсырма түрлерін ұсыну.

Креативті ойлау - инновациялық (жаңа, жаңашыл, басқаларға ұқсамайтын ерекше, қалыптан тыс, үйреншікті емес және т.б.) және тиімді (пәрменді, нәтижелі, үнемді, оңтайлы және т.б.) шешімдерге қол жеткізуге және/немесе жаңа білімді немесе тиімді (әсерлі, шабыттандыратын, ерекше, таңқаларлық және т.б.) қиялды жүзеге асыруға бағытталған идеяларды әзірлеу, бағалау және жетілдіру процесіне нәтижелі қатысу қабілеті ретінде қарастырылады.

Креативтілік пен сын тұрғысынан ойлауды бір мағынада қарауға болмайды. Сын тұрғысынан ойлау берілген мәселені бірнеше адам талқылап нақты қорытындыға келу болса, креативтілік деген жан жақты ойлап, әртүрлі жауап түрлерін ұсыну. Осыған орай біз мектеп жасынан бастап оқушыларды креативті ойлауға дағдыландыруымыз керек. Ол оқушының логикалық ойлауын дамытып, өз ойын еркін айтуға итермелейді.